# Канферэнцыя Новая Беларусь 2025

Варшава, 9–10 жніўня



*Панэль 1:*

# Грамадзянскі пульс: дзе мы апынуліся за 5 гадоў

**Дыскусію мадэраваў журналіст Зміцер Лукашук. У ёй прынялі ўдзел:**

- **Ксенія Луцкіна** — журналістка, былая палітзняволеная, былая супрацоўніца Белтэлебачання;
- **Сяргей Чалы** — эканаміст-аналітык, вядомы аўтар і вядучы аналітычных праграмаў;
- **Дзмітрый Крук** — эканаміст, старэйшы навуковы супрацоўнік BEROC;
- **Наталля Дуліна** — лінгвістка, спецыялістка па італьянскай мове, былая палітзняволеная, былая выкладчыца МДЛУ;
- **Фёдар Паўлючэнка** — медыяменеджар і галоўны рэдактар Reform.by.

Мадэратар Зміцер Лукашук пачаў панэль са звароту пра важнасць рэфлексіі — аналізу апошніх пяці гадоў, а не палітычных справаздачаў.

Ксенія Луцкіна ***ўзгадала праблему палітычных рэпрэсіяў*** і падзякавала дыпламатам за дапамогу ў сваім вызваленні. Луцкіна адзначыла поспехі ў захаванні незалежных медыя і беларускага ютуба, а таксама салідарнасць і фармаванне палітычнай культуры ў грамадстве. Яна заклікала да таго, каб кожны і кожная бралі на сябе адказнасць і дзейнічалі, замест таго каб перакладаць адказнасць на асобныя структуры дэмакратычнага руху.

Наталля Дуліна падкрэсліла неабходнасць вызвалення ад страху і адзначыла, што, нягледзячы на няпоўнае дасягненне мэтаў 2020 года, беларусам (-кам) варта працягваць імкнуцца да зменаў.

Сяргей Чалы назваў ***2020 год момантам фармавання беларускай палітычнай нацыі*** і перамогай дэмакратычных сілаў, параўнаў яе з буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй. Паводле Чалага, Беларуская рэвалюцыя закрыла шэраг «бархатных рэвалюцыяў». Кейс Беларусі паказаў, што яны немагчымыя ў выпадках жорсткіх аўтарытарных рэжымаў з маналітнай структурай кіравання. Ён заклікаў захоўваць адзіную версію гісторыі 2020 года, у чым важную ролю адвёў аналітыкам і творцам. Чалы асудзіў ідэю «перагортвання старонкі», дадаўшы, што вяртанне ў 2019 год немагчымае.

Дзмітрый Крук адзначыў, што ***падзеі апошніх гадоў немагчыма ізаляваць ад рэгіянальнага кантэксту***, асабліва ролі Расіі. Паводле спікера, сёння Беларусь з'яўляецца «закладніцай» геапалітычнага становішча. Ён выказаў меркаванне, што бачанне дэмакратызацыі Беларусі як удару па Расіі менш рэалістычнае, чым бачанне зменаў у самой Расіі як перадумовы для пераменаў у Беларусі. Крук заклікаў захоўваць спадчыну 2020 года, але жыць рэалістычна і ***працягваць інстытуцыялізацыю грамадскага жыцця.*** Галоўнай мэтай пры гэтым ён назваў свабодную, еўрапейскую і дэмакратычную Беларусь, а галоўнай стратэгічнай задачай — выцягванне Беларусі са сферы ўплыву Расіі ці хаця б змяншэнне гэтага ўплыву.

Фёдар Паўлючэнка адзначыў унікальнасць падзеяў 2020 года ў гісторыі

Беларусі і звярнуў увагу на ***масавую эміграцыю, якая з таго часу дасягнула як мінімум паўмільёна чалавек***. Паводле яго, асабістыя сувязі эмігрантаў з роднымі і сябрамі ў Беларусі ўплываюць на сітуацыю нават мацней за працу незалежных медыя. Жыццё ў эміграцыі дазволіла беларусам «пасталець» і як палітычнай нацыі, таму ім патрэбнае прадстаўніцтва — у тым ліку «маўклівай большасці» як у замежжы, так і ў краіне. Палітыкі павінны часцей выказвацца ад яе імя, бо яна памятае падзеі 2020 года. Пераходзячы да тэмы палітвязняў, ён падкрэсліў адказнасць рэжыму за рэпрэсіі і заклікаў дэмсілы не паддавацца на маніпуляцыі рэжыму вызваленнямі і не адмаўляцца ад сваіх палітычных мэтаў.

Размова працягнулася абмеркаваннем зменаў у грамадскім настроі і зніжэнні аптымізму ў публічнай прасторы. Сяргей Чалы адзначыў, што рэпрэсіі і хлусня ўладаў прывялі да стомленасці, аднак параўнаў Беларускую рэвалюцыю з доўгім працэсам падзення камунізму ў Польшчы, нагадваючы, што ***рэвалюцыі часта займаюць дзесяцігоддзі.***

Наталля Дуліна ***падкрэсліла важнасць «цвярозых ацэнак» і вызвалення ад «вывучанай бездапаможнасці».*** Яна адзначыла, што праз падтрымку рэжыму Расіяй змены ў кароткатэрміновай перспектыве немагчымыя, але заклікала арыентавацца на доўгатэрміновую перспектыву і не губляць надзеі. Ксенія Луцкіна адзначыла, што рэпрэсіі не скасавалі змагання за Беларусь і заклікала карыстацца набытай суб’ектнасцю народа, а таксама натхняцца палітзняволенымі, якія не згубілі мараў пра вольную Беларусь нават пасля рэпрэсіяў. У адказ на пытанне з залы яна заклікала пазбаўляцца «правадырызму» і займацца грамадскай дзейнасцю па меры сваіх магчымасцяў.

Дзмітрый Крук заклікаў пазбаўляцца інфантылізму, працягваць фармаванне палітычнай нацыі і змагацца з расійскім уплывам. Фёдар Паўлючэнка таксама адзначыў, што «маўклівая большасць» не мае ілюзіяў наконт магчымасці імгненных зменаў, і ***палітыкам варта фармуляваць больш устойлівыя і рэалістычныя мэты.***

У завяршэнне мадэратар пацікавіўся, ці застаецца ў спікераў вера ў перамены — усе пацвердзілі, што вера захоўваецца.



*Даследаванне*

# «5 гадоў Беларускай рэвалюцыі»

Сацыёлаг і старшы даследчык Цэнтра новых ідэй Генадзь Коршунаў прадставіў даследаванне «5 гадоў Беларускай рэвалюцыі: стварэнне канона і дынаміка эмоцыяў», якое было праведзена ініцыятывай «Ёсць пытанне» сумесна з ЦНІ. Даследаванне стала чарговай — чацвёртай — ацэнкай стаўлення прадэмакратычнай супольнасці да падзеяў 2020–2021 гадоў. Апытанне, праведзенае ў ліпені 2025 года сярод амаль 650 прыхільнікаў дэмакратычных пераменаў, пераважна эмігрантаў, паказала, што больш за 90% рэспандэнтаў лічаць, што тыя падзеі істотна або цалкам змянілі іх жыццё. Вынікі таксама сведчаць аб фармаванні ў гэтай частцы грамадства моцнага кансэнсусу вакол значнасці пратэстаў.

Аналіз таксама паказаў, што эмацыйны фон успрыняцця падзеяў змяняецца: узрастае пачуццё гонару і павагі да ўдзельнікаў рэвалюцыі, адначасова слабеюць эмоцыі злосці і адчаю. Пры гэтым рэпрэсіі працягваюць узмацняцца, што пацвярджаецца ростам колькасці людзей, якія асабіста сутыкнуліся з праследам, або маюць блізкіх у зняволенні. У палітычнай сферы найбольш пазнавальнай лідаркай застаецца Святлана Ціханоўская, у якой таксама найбольш высокі адсотак даверу. Сярод грамадскіх ініцыятываў найбольш вядомымі і карыснымі рэспандэнтамі прызнаныя «Кіберпартызаны», Полк імя Кастуся Каліноўскага і Праваабарончы цэнтр «Вясна».

Падрабязныя вынікі даследавання даступныя па спасылцы:

[перайсці да вынікаў](#)



*Панэль 2:*

# Не спрынт, а марафон: пошук новых сэнсаў і стратэгіяў

**Дыскусію мадэравала грамадская дзяячка, пісьменніца і вядучая Марына Ментусава. Удзел прынялі:**

- **Павел Латушка** — кіраўнік Народнага антыкрызіснага ўпраўлення, намеснік кіраўніцы Аб'яднанага пераходнага кабінета;
- **Франак Вячорка** — галоўны дарадца Святланы Ціханоўскай;
- **Вольга Зазулінская** — прадстаўніца па сацыяльнай палітыцы Аб'яднанага пераходнага кабінета;
- **Арцём Брухан** — спікер Каардынацыйнай рады (Каманда Латушкі і Рух «За Свабоду»);
- **Лізавета Пракопчык** — віцэ-спікерка Каардынацыйнай рады («Моладзевы наступ»);
- **Аляксандр Мілінкевіч** — дарадца Святланы Ціханоўскай па рэалізацыі еўрапейскага выбару Беларусі (пазаштатны).

Размова пачалася з абмеркавання ***галоўных дасягненняў беларускіх дэмакратычных сілаў за апошнія пяць гадоў.***

- Павел Латушка выказаў гонар за прагрэс у прыцягненні рэжыму да міжнароднай адказнасці, адзначыўшы заяву, пададзеную Літвой у Міжнародны крымінальны суд, і заклікаўшы іншыя краіны падключацца да гэтай працы.
- Франак Вячорка назваў дасягненнем тое, што ў ЕС сталі ўсур'ёз размаўляць пра будучае далучэнне Беларусі, — і звярнуў увагу на прынятыя дакументы і рэзалюцыі, якія ў будучыні дапамогуць прасоўваць гэтае пытанне.
- Арцём Брухан адзначыў стварэнне прадстаўнічага інстытута з выбарамі — Каардынацыйнай рады — як значны крок наперад, і выказаў упэўненасць у паступовым расколе элітаў, асабліва па лініі прарасійскіх чыноўнікаў і прыхільнікаў незалежнасці.
- Лізавета Пракопчык вылучыла асаблівасці новага пакалення актывістаў — іх адкрытасць, сумнеў у аўтарытэтах і стратэгічнае мысленне, падкрэсліўшы неабходнасць «вайсковага», стратэгічнага падыходу да палітыкі.
- Аляксандр Мілінкевіч звярнуў увагу, што еўрапейскі выбар Беларусі — гэта працэс, які патрабуе адмовіцца ад ілюзіяў пра нейтральны статус і накіравацца на ўмацаванне духу, самасвядомасці і падрыхтоўку да інтэграцыі ў Еўропу.
- Вольга Зазулінская выказалася пра сацыяльную палітыку, што хоць працэс фармавання сацыяльнай палітыкі ў дэмакратычным руху толькі пачынаецца, патрэба ў ёй відавочная, і дэмсілам варта імкнуцца абараняць беларусаў як у краіне, так і ў эміграцыі. Зазулінская дадала, што дэмакратычны рух павінен улічваць сацыяльныя патрэбы людзей, каб заставацца звязаным з рэчаіснасцю.

***У дыскусіі пра стратэгіі*** Вячорка акцэнтаваў, што ціск на рэжым праз санкцыі і высілкі па яго дэлегітымізацыі быў неабходным і эфектыўным адказам на дзеянні рэжыма з 2020 года. Брухан адзначыў важнасць палітычнай альтэрнатывы і заклікаў працягваць працягваць будаваць інстытуты, спрыяючы расколу ў элітах рэжыма. Мілінкевіч нагадаў пра неабходнасць стратэгічнага мыслення і рэалістычнага падыходу да еўрапейскай інтэграцыі.

Латушка казаў пра санкцыі як інструмент ціску і патэнцыйныя перамовы з рэжымам. Паводле Латушкі, санкцыі не з'яўляюцца перашкодай для магчымага Круглага стала — аднак спікер дадаў, што сам Лукашэнка не будзе ўдзельнічаць у Круглым стале, і ініцыятывы перамоваў скіраваныя на яго атачэнне. Адказваючы на пытанні з залы пазней, Латушка заклікаў партнёраў не здымаць санкцыі без істотных крокаў з боку рэжыму, падкрэсліўшы недавер да абяцанняў Лукашэнкі. Значным крокам ён назваў вызваленне мінімум сотняў палітвязняў. Ён таксама адзначыў, што дыялог з Лукашэнкам магчымы толькі ў момант транзіту ўлады, а на Круглым стале мусяць абмяркоўвацца тэмы рэпрэсіяў, палітзняволеных, дэмакратычных зменаў, дэкрыміналізацыі грамадскай і палітычнай дзейнасці і дэмакратычных выбараў.

***Падчас размовы пра памылкі*** Латушка вылучыў праблему таго, што меншасныя групы, якія прадстаўляюць няшмат людзей, часта выказваюцца гучней за большую частку дэмсілаў — праз тое, што менш баяцца рэакцыі з боку рэжыму. Падобнае меркаванне выказаў і Мілінкевіч. Вячорка прызнаў непадрыхтаванасць рэакцыі на вайну ў 2022 годзе, якую дапамаглі выправіць Полк Каліноўскага, рэйкавыя партызаны, Кіберпартызаны і «Беларускі Гаюн». Брухан вылучыў нізкую яўку на выбары Каардынацыйнай рады.

Спікеры ***абмеркавалі патрэбы і прапановы*** для дэмсупольнасці. Брухан прапанаваў накіроўваць рэсурсы на развіццё існых ініцыятываў замест стварэння новых. Вячорка адзначыў неабходнасць стварэння моцнай інфармацыйнай сеткі, накіраванай на людзей у Беларусі, Зазулінская — фонду сацыяльнай падтрымкі для ўразлівых групаў і беларусаў у эміграцыі. Пракопчык заклікала да стварэння сяброўскіх арганізацыяў, неабавязкова з палітычнымі мэтамі, а Мілінкевіч вылучыў патрэбу ў канкрэтных планах на выпадак змены ўлады, заклікаўшы ўзяць досвед іншых краінаў. Латушка пацвердзіў, што такія планы ўжо існуюць, але не публікуюцца з прычынаў бяспекі. Яны распрацоўваліся ў т. л. былымі высокапастаўленымі чыноўнікамі.

Размова працягнулася ***абмеркаваннем планаў на бліжэйшыя паўгода*** ў працы дэмакратычных сілаў. Павел Латушка адзначыў, што не плануе зменаў і будзе працягваць фокус на прыцягненні рэжыму да адказнасці. Франак Вячорка падкрэсліў неабходнасць узмацнення мераў бяспекі для каманды і партнёраў. Арцём Брухан анансаваў выбары Каардынацыйнай рады, а Лізавета Пракопчык — свае планы больш актыўна ўключацца ў працу КР. Аляксандр Мілінкевіч акцэнтаваў увагу на патрэбе пазбаўляцца стэрэатыпаў і ўсведамляць глабальныя пагрозы аўтарытарных рэжымаў.

***Пытанні з залы таксама датычыліся падтрымкі беларусаў у краіне і замежжы.*** У адказ на пытанне прадстаўніцы нямецкага Hanns Seidel Foundation Латушка заклікаў нямецкіх партнёраў настойваць на падтрымцы

з боку нямецкага ўраду звароту Літвы ў Міжнародны крымінальны суд. Вячорка падкрэсліў значнасць падтрымкі дыяспары праз партыйныя фонды, трэнінгі і публічныя мерапрыемствы, прывёўшы прыклады з Германіі і Швецыі. Зазулінская вылучыла патрэбу ў стварэнні сацыяльнага фонду падтрымкі, а Пракопчык адзначыла неабходнасць садзейнічання дыялогу паміж беларусамі ўнутры краіны і замежжа. Акрамя таго, ваяр Палка Каліноўскага перадаў просьбу надаць больш увагі іх дзейнасці ў медыя, бо з-за абмежаванняў яны не могуць адкрыта выказвацца самі, пры гэтым сутыкаюцца з мноствам праблемаў. Асобна было адзначана, што важна захаваць памяць пра загінулых вяроў для наступных пакаленняў.

***Адказваючы на пытанне пра барацьбу з прапагандай***, Брухан сказаў, што публічныя выказванні і прасоўванне беларускай мовы і спадчыны ўжо з’яўляюцца часткай гэтай змагання. Пракопчык расказала пра досвед «Моладзевага блока», дзе падчас мерапрыемстваў размаўлялі са студэнтамі на зразумелай ім мове, на цікавыя для іх тэмы і з адкрытасцю да дыялогу. Вячорка падкрэсліў, што для супрацьдзеяння прапагандзе неабходна выкарыстоўваць простую мову, развіваць медыяпісьменнасць і падтрымліваць незалежныя СМІ. Ён заклікаў усіх, хто мае магчымасць, актыўна ўдзельнічаць у камунікацыі і стварэнні кантэнту ў сацсетках.



*Дэбаты*

# Ці працуюць санкцыі альбо патрэбна мяняць стратэгію? Уладзімір Жыгар супраць Івана Краўцова

Прадстаўнік каманды Віктара Бабарыкі ***Іван Краўцоў*** пагадзіўся, што санкцыі з'яўляюцца інструментам, але выказаў меркаванне, што апошнія пяць гадоў яны прымяняліся без выразнай стратэгіі. Ён падкрэсліў, што ВУП Беларусі з 2020 года вырас на 24% у доларавым выражэнні, а паводле апытанняў, 62% беларусаў негатыўна ставяцца да санкцыяў. Краўцоў сцвярджаў, што санкцыі ў асноўным б'юць па людзях, а не па рэжыме, і заклікаў гнутка выкарыстоўваць іх як аргумент у перамовах з Лукашэнкам, у тым ліку для дасягнення вызвалення палітвязняў і спынення рэпрэсіяў. Ён таксама адзначыў праблему абыходу санкцыяў праз іншыя краіны (Турцыя, Кітай, Казахстан і г.д.), праз што санкцыі супраць Беларусі губляюць эфектыўнасць, і прапанаваў, каб ЕС далучыўся да амерыканскіх ініцыятываў па перамовах з рэжымам.

Прадстаўнік BELPOL ***Уладзімір Жыгар*** пачаў з таго, што хацелася б бачыць больш эфектыўныя і хуткія рашэнні па санкцыях, але падкрэсліў, што санкцыі неабходныя для процідзеяння ўдзелу беларускіх прадпрыемстваў у расійскім ваенна-прамысловым комплексе. Ён нагадаў, што Лукашэнка спрабуе пашырыць у Беларусі вытворчасць зброі, якая выкарыстоўваецца ў вайне супраць Украіны. Жыгар прызнаў, што санкцыі закранаюць і простых людзей, але лічыць гэта непазбежным, паколькі праблемы выкліканыя дзеяннямі рэжыму — міграцыйным крызісам і саўдзелам у вайне. Ён падкрэсліў, што ўмовы для зняцця санкцыяў павінны ўключаць спыненне рэпрэсіяў, і крытыкаваў Краўцова за адсутнасць працы па ўзмацненні ціску на рэжым з 2020 года.

Такім чынам, Краўцоў адзначыў, што санкцыі, уведзеныя ў сувязі з выкарыстаннем тэрыторыі Беларусі Расіяй у вайне, могуць быць знятыя ў абмен на вызваленне палітычных зняволеных. У сваю чаргу Жыгар падкрэсліў, што санкцыі яшчэ недастаткова білі па «болевых кропках» рэжыму і настойваў на неабходнасці ўзмацнення санкцыяў і распрацоўкі агульнай стратэгіі, каб яны былі накіраваныя на аслабленне яго ваенных і прамысловых магчымасцяў, а не змякчаліся ў абмен на частковыя саступкі.



*Дэбаты*

# Супрацьстаянне да перамогі ці нацыянальнае прымірэнне тут і цяпер? Дзмітрый Шчыгельскі супраць Розы Турарбекавай

Палітычны прадстаўнік Палка Каліноўскага ва Украіне ***Дзмітрый Шчыгельскі*** заявіў, што супрацьпастаўленне барацьбы і прымірэння штучнае — можна і трэба займацца абодвума напрамкамі адначасова. Ён дадаў, што для пачатку перамоваў дэмсілам патрэбныя рычагі ціску — палітычныя, вайсковыя, інфармацыйныя, эканамічныя і г.д., бо без гэтага перамовы скончацца капітуляцыяй. Таксама ён падкрэсліў, што «нацыянальнае прымірэнне» не можа быць мэтай само па сабе, а таму заклікаў фармуляваць патрабаванні і назапашваць рэсурсы. Ён прапанаваў падтрымліваць добраахвотнікаў, ствараць рэзерв, працаваць з насельніцтвам, рыхтавацца да «акна магчымасцяў», а на перспектыву перамоваў вылучыць легітымных прадстаўнікоў — напрыклад, Святлану Ціханоўскую і яе структуры. На пытанне пра чырвоныя лініі, пасля якіх дыялог з рэжымам немагчымы, ён адказаў, што іх няма, бо альтэрнатыва — грамадзянская вайна, але пачатак дыялогу магчымы толькі пры наяўнасці яснай волі з абодвух бакоў.

Гісторык і паліталагіня ***Роза Турарбекава*** пагадзілася, што супрацьпастаўленне штучнае, але адзначыла, што дыялог неабходны ўжо цяпер, нават пры яго складанай рэалізацыі. Яна падкрэсліла, што дыялог не тое самае, што перамовы: дыялог пастаянны, а перамовы могуць быць тэматычнымі і часовымі. Яна заклікала падзяляць гуманітарны трэк (вызваленне палітвязняў) і палітычны трэк. Спікерка выказала меркаванне, што сілы не з’яўляюцца абавязковай умовай пачатку дыялогу. Яна акрэсліла мэты, якія мусяць ставіць дэмслы для дыялогу, — прадухіліць паглынанне Расіяй, спыніць сацыяльны заняпад, аднавіць сувязі ў грамадстве — і прапанавала весці перамовы не толькі з рэжымам, але і з заходнімі партнёрамі. Таксама яна адзначыла патрэбу ў медыятарах без жорсткай пазіцыі і заклікала пачынаць дыялог з фармулёўкі праблемаў, агульных для абодвух бакоў, папярэдзіўшы, што дыялог не гарантуе справядлівасці.

Такім чынам, абодва спікеры адзначылі неабходнасць дыялогу, але ў той час як Шчыгельскі заклікаў да назапашвання рэсурсаў і фармавання моцнай пазіцыі дэмсілаў, Турарбекава выказала меркаванне, што дыялог магчымы і патрэбны ўжо цяпер, хоць і не гарантуе пажаданых для дэмсілаў вынікаў.

*Дэбаты*

# Ці выйграе эканоміка Беларусі ад уступлення ў Еўрасаюз? Аліса Рыжычэнка супраць Льва Львоўскага

Прадстаўніца Аб’яднанага Пераходнага Кабінета па эканоміцы і фінансах ***Аліса Рыжычэнка*** заявіла, што еўраінтэграцыя — адзіны перспектыўны з эканамічнага пункту гледжання шлях развіцця Беларусі. Яна падкрэсліла, што эканоміка краіны моцна залежыць ад Расіі (больш за 50% экспарту ідзе ў Расію і яшчэ 15–20% праз Расію), а доля высокатэхналагічных тавараў складае менш за 7%, што сведчыць пра неэфектыўнасць эканамічнай мадэлі. Рыжычэнка дадала, што ЕС — гэта не абстракцыя, а рэальны доступ да рынку ў 450 млн чалавек, рэсурсаў для рэформаў, тэхналогіяў і інвестыцыяў. Па яе словах, хуткае правядзенне рэформаў пры падтрымцы ЕС дапаможа пазбегнуць негатыўных сцэнарыяў, падобных да алігархізацыі пасля распаду СССР. Яна адзначыла, што неабходна забяспечыць празрыстасць і эфектыўнасць зменаў, весці дыялог з грамадствам, працаваць з іх страхамі праз інфармаванне і контрпрапаганду, а таксама мець загадзя распрацаваны план мінімізацыі рызыкаў. Рыжычэнка падкрэсліла, што сцэнар «швейцарскага нейтралітэту» немагчымы з-за поўнай залежнасці ад Расіі і адсутнасці рэсурсаў. На яе думку, выбар на карысць ЕС — гэта шлях да стабільнасці, даверу і паляпшэння якасці жыцця.

Дырэктар аналітычнага цэнтра BEROC ***Леў Львоўскі*** пагадзіўся, што Еўропа прапануе больш перспектыў, чым Расія, але папярэдзіў, што працэс уступлення ў ЕС не хуткі і не лёгкі. Ён дадаў, што, каб перадухіліць масавую эміграцыю ў выпадку далучэння да ЕС, неабходна папярэдне забяспечыць еўрапейскую прадукцыйнасць працы, а таксама канкурэнтаздольнасць прадпрыемстваў, высокі ўзровень жыцця і «ўнутранага еўрапейца» ў каштоўнасцях. Ён падкрэсліў, што большасць беларусаў цяпер не гатовыя да ўступлення, таму трэба весці шырокую ўнутраную працу з грамадствам. Львоўскі адзначыў, што характар разрыву з Расіяй вызначыць эканамічныя наступствы: рэзкі разрыў можа прывесці да падзення ВУП на 20–30% і шматгадовага аднаўлення, паступовы — мінімізуе шок. Ён таксама разважаў пра альтэрнатыўныя сцэнары, прызнаўшы, што варыянт доўгатэрміновага росту без уступлення ў ЕС магчымы толькі пры малаверагодных знешніх абставінах. Ён пагадзіўся, што сцэнар «швейцарскага нейтралітэту» сёння немагчымы, бо краіна не мае ні рэсурсаў, ні геапалітычных умоваў для гэтага, і таму заклікаў вызначацца з кірункам інтэграцыі.

Такім чынам, спікеры лічаць сцэнар «швейцарскага нейтралітэту» немагчымым і бачаць інтэграцыю з ЕС больш перспектыўным сцэнаром за збліжэнне з Расіяй. Рыжычэнка падкрэсліла неабходнасць хуткіх рэформаў пры падтрымцы ЕС, Львоўскі — складанасць і працягласць шляху, патрэбу папярэдняга павышэння прадукцыйнасці і шырокай працы з грамадствам.

# Red Paper — прэзентацыя Аліны Харысавай

Паліталагіня і экспертка Офіса Святланы Ціханоўскай Аліна Харысава прэзентавала аналітычны дакумент ***Red Paper***, у падрыхтоўцы якога выступіла ў якасці галоўнай рэдактаркі. Дакумент быў упершыню прадстаўлены на Саміце NATO ў Гаазе і дапрацаваны пасля гэтага. ***Red Paper*** апісвае Беларусь як асобны суб'ект у рэгіянальнай бяспецы — гэта адрознівае яго ад большасці аналітычных падыходаў, дзе краіна разглядаецца выключна як «прыдатак Расіі».

У дакуменце аналізуюцца шэсць ключавых напрамкаў бяспекі:

- ***Ваенная*** — роля Беларусі як саагрэсара ў вайне з Украінай, павелічэнне ваенных выдаткаў, супрацоўніцтва з іншымі аўтарытарнымі дзяржавамі.
- ***Энергетычная*** — крытычная залежнасць ад Расіі ў газе, нафце і электрычнасці, а таксама стан зялёнай энергетыкі.
- ***Інфармацыйная*** — структура дзяржаўнай прапаганды, асноўныя наратывы і механізмы інфармацыйных атакаў на ЕС.
- ***Эканамічная*** — удзел беларускіх кампаніяў у забеспячэнні расійскай вайсковай машыны, фінансавая ўразлівасць краіны.
- ***Міграцыйная*** — выкарыстанне арганізаванага міграцыйнага крызісу як інструмента гібрыднай вайны.
- ***Моладзевая*** — рэпрэсіі і ідэалагічны кантроль над адукацыяй, якія вядуць да адтоку мазгоў і адрыву моладзі ад еўрапейскай прасторы.

Асобная ўвага прысвечаная рэкамендацыям, скіраваным на тое, каб ЕС, NATO і іншыя міжнародныя партнёры перасталі ўспрымаць Беларусь толькі праз прызму Расіі і пачалі працаваць з ёй як з асобным гульцом, які нясе і пагрозы, і магчымасці. Прапановы ўключаюць інтэграцыю Беларусі ў еўрапейскую архітэктуру бяспекі, інвестыцыі ў разведку і маніторынг у рэальным часе, удзел беларускіх экспертаў (-к) у сістэмах ЕС і NATO, падрыхтоўку плану рэформаў сектара бяспекі пасля Лукашэнкі і падтрымку моладзі як доўгатэрміновай стратэгіі.

***Red Paper*** пазіцыянуецца як практычны інструмент і аналітычная аснова для міжнародных дзеянняў у дачыненні да Беларусі ўжо цяпер, а не толькі пасля палітычных пераменаў. Дакумент можа выкарыстоўвацца беларускімі палітыкамі і экспертамі (-камі) ў працы з міжнароднымі партнёрамі (-камі) і палягчаць апошнім разуменне магчымай ролі Беларусі ў рэгіянальнай бяспецы.

Азнаёміцца з Red Paper можна па спасылцы:

Red Paper

# Даклад BELPOL пра саўдзел рэжыму Лукашэнкі ў вайне супраць Украіны — прэзентацыя Мацвея Купрэйчыка

Публічны прадстаўнік арганізацыі BELPOL Мацвей Купрэйчык прэзентаваў ***даклад пра саўдзел рэжыму Лукашэнкі ў вайне Расіі супраць Украіны.*** Даклад быў упершыню прадстаўлены ў траўні 2025 года на Канферэнцыі беларусаў і беларусак свету, пасля чаго BELPOL працавалі з замежнымі партнёрамі, у тым ліку прэзентуючы ім закрытую частку дакумента.

У дакладзе паказана, што палітычнае кіраўніцтва і ***ваеннае камандаванне Беларусі загадзя ведала пра падрыхтоўку расійскага ўварвання,*** садзейнічала фармаванню наступальнай групоўкі войскаў РФ на тэрыторыі краіны, забяспечвала яе лагістыку, інфраструктуру, ахову флангаў і праводзіла аператыўную маскіроўку, каб увесці ў зман Украіну і міжнародную супольнасць. ***Пасля пачатку ўварвання беларускі бок удзельнічаў у падвозе боепрыпасаў,*** забеспячэнні сувязі, транспарціроўцы войскаў, тэхнічным абслугоўванні авіяцыі РФ. ***На сённяшнім этапе вайны рэжым працягвае пастаўкі ваеннай тэхнікі,*** шасі, боепрыпасаў і прадукцыі для патрэбаў расійскай арміі.

Галоўная выснова дакладу — рэжым Лукашэнкі з'яўляецца ***поўнафарматным саўдзельнікам агрэсіі Расіі супраць Украіны***. BELPOL падкрэслівае, што нягледзячы на выдачу Міжнародным крымінальным судом ордара на арышт Пуціна, такая мера пакуль не была выкарыстаная супраць Лукашэнкі — і таму арганізацыя пацвярджае гатоўнасць ініцыяваць працэдуру прыцягнення Лукашэнкі, кіраўніцтва Узброеных сілаў, сілавых структураў і дзяржаўнага ваенна-прамысловага комплексу Беларусі да крымінальнай адказнасці і прадставіць для гэтага доказы.

У рамках працы па прасоўванні дакладу BELPOL правёў брыфінгі ў МЗС шэрагу краінаў, у Еўрапейскай службе знешніх дзеянняў, прэзентаваў даклад на форуме і для некаторых партнёраў. У т. л. у выніку дзейнасці BELPOL былі падрыхтаваныя ***19 санкцыйных пакетаў***, у якія ўключаныя не менш за 40 кампаніяў і больш за 40 фізічных асобаў, датычных да падтрымкі расійскай ваеннай машыны.



*Панэль 3:*

# Рэгіянальная бяспека: Беларусь 2027

**Дыскусію мадэраваў журналіст Зміцер Міцкевіч. У ёй прынялі ўдзел:**

- **Вадзім Кабанчук** — прадстаўнік па абароне і нацыянальнай бяспецы Аб’яднанага пераходнага кабінета;
- **Беата Паташова** — каардынатарка праграмаў публічнай дыпламатыі NATO;
- **Мацвей Купрэйчык** — прадстаўнік ініцыятывы BELPOL;
- **Маргарыта Ворыхава** — прадстаўніца па моладзевай палітыцы і студэнцтве Аб’яднанага пераходнага кабінета;
- **Мікіта Забуга** — ваяр Палка імя Кастуся Каліноўскага;
- **Аліна Харысава** — паліталагіня, экспертка па стратэгіі і аналітыцы Офіса Святланы Ціханоўскай.

Размова пачалася з абмеркавання ***магчымых сцэнарыяў выкарыстання Беларусі ў эскалацыі*** высілкаў Расіі супраць Захаду. Вадзім Кабанчук адзначыў, што Беларусь з-за свайго геаграфічнага становішча можа стаць ключавым плацдармам для расійскай агрэсіі, у прыватнасці, з улікам даўжыні мяжы з Украінай і ЕС, якая ўдвая перавышае мяжу з Расіяй. Ён таксама выказаў занепакоенасць за Балтыю як патэнцыйны цэнтр эскалацыі і адзначыў магчымасць перафарматавання абарончых саюзаў у выпадку крызісу.

Мацвей Купрэйчык дапоўніў, што ***беларуская ўлада ўжо ўцягвае краіну ў вайну праз ваенную прамысловасць і прапаганду***, у тым скіраваную ліку на дзяцей. Ён нагадаў пра міграцыйны крызіс і расійскія дроны, якія выкарыстоўваюцца для пошуку слабых месцаў у абароне краінаў NATO. Ён таксама расказаў, што ў краінах ЕС, асабліва ў Балтыі, існуюць агентурныя сеткі Крамля і Лукашэнкі, якія ў тым ліку рэкрутуюць праз даркнэт, а таксама адзначыў ролю крымінальных элементаў у гэтых аперацыях.

Маргарыта Ворыхава распавяла пра ***формы супраціву ўнутры Беларусі:*** актыўную працу па моладзі, дапамогу ў пазбяганні прызыву, інфармацыйныя кампаніі і праекты накшталт «Гаюна». Яна падкрэсліла, што супраціў мае рызыкі пераследу, таму людзі ўсё больш баяцца ўцягвацца ў адкрытую актыўнасць. Ворыхава таксама вылучыла важнасць альтэрнатыўнай інфармацыі і падтрымкі інфармацыйных кампаніяў, бо беларусы ў большасці супраць вайны.

Мікіта Забуга закрануў тэму беларусаў за мяжой і ***прапанаваў ствараць нацыянальныя ваенныя падраздзяленні ў краінах NATO***, каб выкарыстаць вайсковы патэнцыял беларускай дыяспары, якая, паводле Мікіты, налічвае каля 2 мільёнаў чалавек, у тым ліку сотні тысячаў з вайсковымі спецыяльнасцямі. Ён адзначыў прыклад Украіны, якая хутка фармавала нацыянальныя падраздзяленні пры ўзнікненні неабходнасці. Забуга падкрэсліў недахоп рэсурсаў у сённяшніх добраахвотнікаў і падзякаваў

Аб’яднанаму пераходнаму кабінету за пастанову аб іх падтрымцы. Спікер выказаў надзею, што беларускія падраздзяленні стануць падмуркам вызвалення Беларусі ў будучыні.

Аліна Харысава адзначыла, што палітыкі дэмакратычных краінаў звяртаюць увагу на тое, што ім можа прынесці палітычную выгаду, таму трэба тлумачыць беларускае пытанне ў гэтым кантэксце і ***актыўна працаваць з медыя для фармавання грамадскай думкі***, якая ўплывае на палітыкаў.

Беата Паташова патлумачыла, што ***рашэнні па стварэнні нацыянальных падраздзяленняў беларусаў у краінах NATO залежаць ад кожнай асобнай краіны*** і што ў некаторых ужо ёсць механізмы прадастаўлення грамадзянства за службу ў арміі. Яна таксама падкрэсліла, што Беларусь застаецца ў цэнтры ўвагі NATO ў кантэксце ваеннай інтэграцыі з Расіяй, а супрацоўніцтва з рэжымам Лукашэнкі спыненае, але ёсць кантакты з прадстаўнікамі дэмакратычнай супольнасці.

У адказ на прапанову стварыць аналітычны цэнтр па Беларусі пры NATO Паташова заявіла, што дадатковыя бюракратычныя структуры не патрэбныя, бо ўжо існуе палітычны аддзел, які займаецца гэтым пытаннем. На пытанне пра тое, як NATO ўспрымае рэжым Лукашэнкі, яна адзначыла, што асуджэнне рэжыму было зафіксаванае на саміце 2021 года, але знешняя палітыка залежыць ад асобных краінаў. На пытанне пра Беларусь як магчымасць, а не толькі пагрозу бяспекі Паташова адзначыла, што NATO разумее, што інтэграцыя Беларусі ў еўрапейскую сістэму бяспекі была б карысной для Еўропы, але дадала, што ***палітыка NATO фармуецца з сённяшняй сітуацыі:*** рэжым у Беларусі — саюзнік Расіі, а гэта пагроза. Харысава, спаслаўшыся на досвед размоваў з палітыкамі краінаў NATO, адзначыла, што, хоць альянс зацікаўлены ў наяўнасці бяспечнага суседа, яго намаганні ў першую чаргу скіраваныя на забеспячэнне бяспекі дзяржаваў-чальцоў.

Украінскі палітолаг Яўген Магда з залы выказаў меркаванне, што беларусам замежжа трэба працаваць не над стварэннем ваенных падраздзяленняў, а над інфармацыйным уплывам і падтрымліваць кантакты з людзьмі ўнутры Беларусі, каб стаць агентамі зменаў. Вадзім Кабанчук жа падкрэсліў, што стварэнне беларускіх вайсковых падраздзяленняў у краінах NATO — гэта ўзаемавыгаднае рашэнне, якое магло б стварыць альтэрнатыву для сілавікоў рэжыму на выпадак эскалацыі. Мацвей Купрэйчык прапанаваў пачаць дыскусію пра беларускія падраздзяленні ў NATO праз канферэнцыі і інфармацыйную працу, выкарыстоўваючы досвед Палка Каліноўскага і Кіберпартызанаў, а таксама падкрэсліў ***магчымасці верыфікацыі беларускіх грамадзянаў*** сродкамі BELPOL і іншых ініцыятываў.

*Групавая праца*

# Круглы стол з рэжымам: як мог бы выглядаць дыялог? — прэзентаваў Арцём Брухан

На прэзентацыі разглядалася магчымасць правядзення Круглага стала паміж дэмакратычнымі сіламі і рэжымам пры ўдзеле міжнародных партнёраў як аднаго з магчымых шляхоў выхаду з палітычнага крызісу. Было адзначана, што на шляху да такой сустрэчы існуе шэраг сур'ёзных перашкодаў. Сярод іх — поўнае нежаданне рэжыму весці размову з дэмсіламі і публічнае адмаўленне факту крызісу, адсутнасць у дэмсілаў дастатковых рычагоў сілы, а таксама моцны ўплыў Расіі на сітуацыю ў Беларусі. Дэмакратычныя сілы пакуль не маюць адзінай пазіцыі па пытанні перамоваў, што таксама стварае дадатковыя цяжкасці. Захоўваецца і верагоднасць адкату дамоўленасцяў нават пасля перамоваў, асабліва з улікам таго, што для рэжыму прыярытэтам застаецца сіла. Дадаецца праблема адсутнасці бяспечнай і зразумелай платформы для дыялогу, а таксама выразнай фасілітацыі працэсу.

Сярод прапанаваных крокаў — выпрацоўка і ўзгадненне адзінай пазіцыі паміж усімі прадстаўнікамі дэмакратычных сілаў Беларусі, пошук саюзнікаў, медыятараў і патэнцыйных перамоўшчыкаў у міжнароднай супольнасці з акцэнтам на важнасць Беларусі для рэгіянальнай бяспекі, а таксама падрыхтоўка канкрэтных прапановаў для асобных прадстаўнікоў рэжыму і элітаў, скіраваных на іх раскол і змяншэнне ўплыву Лукашэнкі.

*Групавая праца*

# Эфектыўнасць дэмакратычных сілаў: як узмацніць рух? — прэзентаваў Вадзім Мажэйка

У прэзентацыі былі разгледжаны асноўныя перашкоды, якія замінаюць павышэнню эфектыўнасці дэмакратычнага руху, і прапанаваныя магчымыя шляхі іх пераадолення. Асаблівая ўвага была нададзеная ўнутраным праблемам: недастатковаму ўзаемадзеянню паміж рознымі структурамі і адсутнасці адзінства, розным падыходам і бачанням, нізкаму ўзроўню даверу і адсутнасці моцнай культуры дэмакратычнай камунікацыі. Звярталася ўвага на тое, што дэмакратычныя сілы мала працуюць з масамі, недастаткова прыслухоўваюцца да беларусаў унутры краіны і не прапануюць дастаткова пазітыўнай павесткі. Таксама не хапае празрыстай і зразумелай структуры, а фінансавыя і інтэлектуальныя рэсурсы застаюцца абмежаванымі. Да знешніх фактараў, якія перашкаджаюць дзейнасці, былі аднесеныя рэпрэсіі, вайна Расіі супраць Украіны, маргіналізацыя тэмы Беларусі на міжнароднай арэне,

уплыў Расіі і недахоп фінансавання.

Сярод прапаноў прагучала ідэя будавання «Рэспублікі» як супольнай справы, што прадугледжвае пераход ад прадстаўнічых функцыяў да выканаўчых, развіццё самафінансавання і стварэнне рэальных выгодаў для грамадзянаў, у т. л. праз інструменты лічбавай дзяржавы. Было прапанавана сумесна вызначаць стратэгічныя, тактычныя і аперацыйныя мэты, больш актыўна працаваць з людзьмі, наладжваць супрацоўніцтва з тымі, хто застаецца ўнутры Беларусі, падтрымліваць супраціў і кансалідаваць дыяспару.

*Групавая праца*

## Салідарнасць і падтрымка: як палепшыць дапамогу? — прэзентавала Алана Гебрэмарыям

Алана Гебрэмарыям ад імя групы адзначыла, што сістэма дапамогі беларусам, якія пацярпелі ад рэпрэсіяў, сутыкаецца з сур’ёзнымі бар’ерамі. Сярод іх — элітарнасць дапамогі з акцэнтам пераважна на палітвязняў, вакуум падчас эвакуацыі, недахоп надзейных каналаў камунікацыі ўнутры краіны, палітычная апатыя з боку міжнароднай супольнасці і слабая міжінстытуцыйная каардынацыя. Дадаюцца праблемы заканадаўчых абмежаванняў, падзелу паміж тымі, хто застаўся ў Беларусі, і тымі, хто з’ехаў, адсутнасці стратэгічнага плану, недахопу адкрытасці, справаздачнасці і даверу, а таксама фінансавых рэсурсаў. Асобна былі падкрэсленыя праблемы асацыяцыі Беларусі з Расіяй, недахопу дапамогі па-за межамі ЕС, небяспечных каналаў камунікацыі і адсутнасці сістэмнай падтрымкі пасля эміграцыі.

У якасці рашэнняў група прапанавала развіццё кансультацыйнага цэнтра «Адно акно» для псіхалагічнай, юрыдычнай і эвакуацыйнай дапамогі, кол-цэнтра для аператыўнага рэагавання на праблемы рэпрэсаваных і кансультацыйнага пулу з былых палітвязняў для дапаможных арганізацыяў.



*Групавая праца*

# Жаночае лідарства: як зняць бар’еры і павысіць бачнасць жанчын у руху? — прэзентавала Наста Базар

Наста Базар звярнула ўвагу на сістэмныя перашкоды для жаночага лідарства ў беларускім дэмакратычным руху. Сярод іх — устойлівыя стэрэатыпы, сіндром самазванкі, рызыкі, звязаныя з бяспекай, ніжэйшыя заробкі ў жанчын, недахоп падтрымкі (у тым ліку ад іншых жанчын), складанасць сумяшчэння лідарскай ролі з іншымі сацыяльнымі абавязкамі, а таксама харасмэнт і сэксізм. Дадатковай праблемай з’яўляецца тое, што голас мужчын часта ўспрымаецца больш аўтарытэтным, а пры асвятленні ролі жанчын у публічнай прасторы ўвага часта канцэнтруецца на знешнім выглядзе або эмацыйных аспектах замест прафесійных якасцяў чалавека.

Былі прапанаваныя тры блокі рашэнняў. Першы — механізмы супрацьдзеяння бар’ерам: фармаванне інстытута рэпутацыі, выкарыстанне ўплыву міжнародных партнёраў і забеспячэнне гендарнага балансу ў публічнай і арганізацыйнай дзейнасці. Другі — падтрымка: развіццё сястрынства, прыцягненне большай колькасці мужчын да прасоўвання жанчын у публічнай прасторы і павелічэнне долі жанчын сярод асобаў, якія прымаюць рашэнні. Трэці — адукацыя: прызнанне і размеркаванне працы, звязанай з забеспячэннем бачнасці, стварэнне адукацыйных праграмаў, а таксама навучанне па гендарнай роўнасці.

*Групавая праца*

# Еўрапейскі выбар vs рускі мір: як перамагчы? — прэзентавала Аляксандра Мамаева

Аляксандра Мамаева, прэзентуючы групавую працу, падкрэсліла, што беларускасць па сваёй сутнасці з’яўляецца еўрапейскасцю, а еўрапейская інтэграцыя дае магчымасць беларусам (-кам) захаваць нацыянальную ідэнтычнасць. Яна прапанавала змяніць парадыгму супрацьпастаўлення «Еўропа vs Расія» і будаваць беларускую нацыянальную ідэю на каштоўнасцях, якія супадаюць з еўрапейскімі, у тым ліку хрысціянскімі. Замест шокавай тэрапіі і поўнага разрыву сувязяў з Расіяй, было прапанавана падтрымліваць столькі эканамічных і іншых адносінаў, колькі маюць іншыя краіны-суседзі, пры гэтым паказваючы перавагі еўрапейскай мадэлі і канкурэнтаздольнасць беларускасці.

Асобную ўвагу спікерка надала інфармацыйна-адукацыйнай сферы:

развіццю незалежнай інфармацыйнай прасторы, пашырэнню культурнага і адукацыйнага кантэнту ў медыя, стварэнню беларускамоўнай і не прарасійскай адукацыі, у тым ліку ў анлайн-фарматах, а таксама забеспячэнню доступу да еўрапейскай адукацыі. Прагучаў заклік разбураць міфы пра Расію як «старэйшага брата».

У эканамічным вымярэнні група прапанавала рыхтаваць грамадства да інтэграцыі праз інфармаванне пра магчымасці, якія дае ЕС, і яго фінансавую падтрымку, а таксама стварэнне плана энергетычнай бяспекі. Таксама ўвагу трэба надаваць пазітыўнаму ўплыву ЕС на прававую сістэму.

У палітычным блоку была адзначана неабходнасць развіцця традыцыяў парламентарызму, інтэграцыі еўрапейскіх нормаў у новае заканадаўства, падтрымання адкрытасці ЕС і мабільнасці як прыярытэтаў дэмакратычных сілаў, а таксама фармавання стратэгіі еўрапейскай інтэграцыі. Сярод прапаноў — праца з дыяспарай, падрыхтоўка заяўкі на ўступленне ў ЕС, стварэнне альянсу з Украінай, Грузіяй і Малдовай супраць расійскага ўплыву, прасоўванне заключэння парламентамі дакументаў аб фіксацыі еўрапейскага выбару Беларусі, арганізацыя канферэнцыі па еўрапейскай перспектыве Беларусі падчас старшынства Літвы ў ЕС, працяг удзелу ва Усходнім партнёрстве і магчымае супрацоўніцтва з Польшчай у сферы бяспекі.



*Панэль 4:*

# Разам з людзьмі: формы сувязі, давер і ўзаемаадказнасць

**Дыскусію мадэравала журналістка Кацярына Ерусалімская. Удзел прынялі прадстаўнікі і прадстаўніцы Каардынацыйнай рады:**

- **Арцём Брухан** (спікер);
- **Лізавета Пракопчык** (віцэ-спікерка);
- **Валер Мацкевіч** («Еўрапейскі Выбар»);
- **Віталь Рымашэўскі** («Наша Справа»/БХД);
- **Таццяна Мартынава** («Хопіць баяцца»);
- **Юрый Губарэвіч** (Каманда Латушкі і Рух «За Свабоду»);
- **Аляксандр Кныровіч** («Беларусы»);
- **Аляксандра Дойніч** («Моладзевы Наступ»);
- **Аляксандр Кабанаў** («Воля») (далучыўся па ўласнай ініцыятыве пазней).

Размова пачалася з агульнай ацэнкі працы Каардынацыйнай рады (КР) і маштабу ўдзелу беларусаў у выбарах у гэты орган. Арцём Брухан адзначыў, што ў беларускага грамадства вельмі абмежаваныя магчымасці зваротнай сувязі з палітыкамі і што выбары ў КР — адзін з нямногіх такіх інструментаў. Ён падкрэсліў ***важнасць максімальнага ўцягнення людзей у наступныя выбары*** ў 2026 годзе, прапанаваўшы ўсталяваць дэдлайн на другую палову красавіка.

Валер Мацкевіч сказаў, што ***неабходна арыентавацца не толькі на людзей у Беларусі, але і на каля 0,5–1 мільёна беларусаў у эміграцыі***, у якіх ёсць шырокія сувязі з роднымі ўнутры краіны — гэта можа быць моцным каналам камунікацыі. Ён у т.л.заклікаў не распаўсюджваць наратывы рэжыму і не пераносіць адказнасць за праблемы на санкцыі — шмат у якіх праблемах вінаваты сам рэжым.

Таццяна Мартынава падкрэсліла, што КР дапамагае людзям, у тым ліку вымушаным з’ехаць, вырашаць практычныя праблемы (напрыклад, з дакументамі), каб яны адчувалі падтрымку і не заставаліся сам-насам са сваімі цяжкасцямі. Мартынава звярнула ўвагу, што хоць каля мільёна беларусаў з’ехалі, рэжым працягвае пераслед і таму барацьба не скончаная. ***Маўчанне ўнутры краіны — вынік страху, а не перамогі рэжыму.***

Віталь Рымашэўскі падкрэсліў ***неабходнасць змяняць акцэнты з патрабаванняў жорсткіх санкцыяў на падтрымку беларусаў у паўсядзённым жыцці*** — напрыклад, дамагацца адкрыцця межаў. Паводле Рымашэўскага, толькі так можна зноў прыцягнуць да палітыкі і беларусаў унутры краіны, і тых, хто знаходзіцца ў эміграцыі. Ён падкрэсліў, што большасць дэмакратычных сілаў у выгнанні маюць мала шанцаў прыйсці да ўлады, таму важна падтрымліваць людзей унутры Беларусі. Ён адзначыў неабходнасць рэальнага ацэньвання магчымасцяў.

Юрый Губарэвіч адказаў на пытанне пра раскол паміж беларусамі ўнутры і звонку краіны. Ён лічыць, што ***большасць беларусаў па-ранейшаму падтрымлівае дэмакратычны рух.*** Паводле яго, галоўнай перашкодай для ўдзелу з'яўляецца бяспека, але захоўваць надзею і праводзіць выбары — важна. Губарэвіч падкрэсліў, што рэжым пераследуе незалежных кандыдатаў і арганізацыі унутры краіны, праз што беларусы за мяжой павінны быць актыўнымі агентамі змяненняў.

Лізавета Пракопчык адзначыла, што сітуацыя змяняецца — прапаганда рэжыму ўзмацняецца, многія людзі расчароўваюцца, і нельга абапірацца толькі на наратывы 2020 года. ***Трэба змяняць падыход і наратывы і не чакаць зменаў звонку.*** Значна большы рэсурс да зменаў, паводле Пракопчык, маюць людзі ўнутры краіны.

Аляксандр Кнырові выказаў крытычны погляд на Каардынацыйную раду (КР), параўнаўшы яе са структурамі, якія існуюць у стане імітацыі. Для ажыўлення і КР, і іншых структураў Кнырові з***аклікаў да канкурэнцыі ідэяў для праўдзівага напаўнення зместам.*** Ён спрагназаваў, што да 2030 года для Беларусі не будзе акна магчымасцяў, і акцэнтаваў неабходнасць захавання энергіі 2020 года і сувязяў з людзьмі ўнутры краіны. Ён таксама крытыкаваў недастатковае абмеркаванне важных тэмаў у КР, а затым разам з Лізаветай Пракопчык пакінуў панэль у знак пратэсту.

Аляксандра Дойніч адзначыла, што галоўны прыярытэт — гэта ***падтрымліваць сувязь з беларусамі і працаваць ва ўласных фракцыях і камісіях,*** а інстытуцыяналізацыя дэмсілаў сама па сабе не з'яўляецца каштоўнасцю. Вынікі працы ёсць, хоць іх не заўсёды бачаць шырока, а гатоўнасць людзей да ўзаемадзеяння са структурамі дэмсілаў залежыць ад рэальных вынікаў іх дзейнасці.

***У адказ на пытанне пра рэалізаваныя перадвыбарчыя праграмы прадстаўнікі розных фракцыяў адзначылі:***

- Рымашэўскі: змаганне супраць «жалезнай заслоны», праца па праблемах беларусаў накшталт пераследу вернікаў у Беларусі;
- Мацкевіч: дапамога добраахвотнікам, легалізацыя беларусаў у ЕС;
- Мартынава: працяг супраціву рэжыму і падтрымка беларусаў унутры і па-за краінай, развіццё сувязяў з Украінай;
- Губарэвіч: падтрымка нацыянальнай ідэнтычнасці, салідарнасць з беларусамі ўнутры краіны, праца па прыцягненні рэжыму да адказнасці.
- Кабанаў: ініцыятывы па рэгіянальнай і нацыянальнай бяспецы, стварэнне камісіяў, супрацоўніцтва паміж структурамі ў выгнанні.
- Дойніч: праца з моладдзю, дапамога ў адукацыйных працэдурах, а таксама барацьба з дыскрымінацыяй.

# Бліц-прэзентацыі: найлепшыя практыкі і інавацыі

## *Платформа «Гэта Моладзь!»*

Маргарыта Ворыхава прадставіла адзіны інфармацыйны і кансультацыйны цэнтр для беларускай моладзі «Гэта Моладзь!», які дапамагае ў пытаннях паступлення, працы, рэлакацыі, грамадзянскага ўдзелу і пазбягання вайсковай службы. Платформа аб’ядноўвае гайды, інструкцыі, кантакты і індывідуальную падтрымку, працуе з універсітэтамі і дапамагае выпускнікам з пацверджаннем адукацыі і працоўнымі дазволамі. Асноўная мэта — супрацьстаяць доўгатэрміновай індактрынацыі моладзі аўтарытарным рэжымам.

## *Пазітыўная альтэрнатыва для Беларусі*

Анатоль Лябедзька распавёў пра стратэгію падрыхтоўкі да будучыні пасля змены ўлады. Створаны праект Канстытуцыі, канцэпцыі рэформаў і законапраекты. У працу былі ўцягнутыя дзясяткі тысячаў людзей, а праекты даступныя на сайце ***kanstytucyja.online***. Гэтыя дакументы дэманструюць, што альтэрнатыва — не пра помсту, а пра адказную падрыхтоўку, і служаць сігналам чыноўнікам і грамадству ў Беларусі. Падкрэсленая сувязь праекта з еўраінтэграцыяй і яго патэнцыял да расколу элітаў.

## *Канцэпцыя люстрацыі*

Леанід Марозаў прадставіў механізм праверкі і адхілення ад пасадаў асобаў, звязаных з рэпрэсіўным рэжымам, каб абараніць дэмакратыю і ачысціць дзяржапарат. Асновай стаў досвед іншых еўрапейскіх краінаў (найбольш рэлевантным прызнаны польскі досвед). Паводле праекта, людзі, якія не парушалі правоў чалавека, могуць працягнуць працу ў сістэме. Люстрацыя будзе праводзіцца праз суд, з улікам індывідуальных абставінаў, што павінна зняць страх у сумленных чыноўнікаў.

## *Культурніцкая дыпламатыя*

Крысціна Шыянок паказала, як праз культуру можна ўмацоўваць вобраз Беларусі за мяжой і ўплываць на міжнародныя адносіны. Офіс дэмсілаў у Чэхіі арганізуе ўдзел беларускіх творцаў у падзеях, перформансы, распавядае пра беларускія помнікі ў Чэхіі. Такія ініцыятывы — частка «мяккай сілы», якая працуе праз прыцягненне, а не прымус. Крысціна заклікала азнаёміцца з публікацыяй пра культурніцкую дыпламатыю, падрыхтаванай да Канферэнцыі:

Культурніцкая дыпламатыя

## *Міжпарламенцкі Альянс дэпутацкіх групаў «За дэмакратычную Беларусь»*

Анатоль Лябедзька прадставіў парасонавае аб'яднанне прадстаўнікоў (-ц) 25 парламентаў і міжнародных парламенцкіх структураў, што падтрымліваюць Беларусь і беларусаў (-к). Альянс працуе праз сустрэчы, акцыі салідарнасці, рэзалюцыі, слуханні і заканадаўчыя ініцыятывы. Сярод вынікаў — «Люксембургскія рашэнні» з рэкамендацыямі для парламентаў, пагадненне аб супрацоўніцтве з Еўрапарламентам, стажыроўкі для маладых беларусаў, заканадаўчая падтрымка дэмакратычнай Беларусі. Планы ўключаюць пашырэнне геаграфіі групаў, падпісанне новых мемарандумаў і імплементацыю Люксембургскіх рашэнняў у нацыянальнае заканадаўства краінаў-чальцоў. Беларусы могуць наўпрост звяртацца да чальцоў групаў з прапановамі і праблемамі.

## *Дзейнасць дэмсілаў Беларусі ў Радзе Еўропы і ПАРЕ*

Аляксандра Мамаева прадставіла дзейнасць беларускіх дэмсілаў праз Кантактную групу і дэлегацыі ў ПАРЕ і Кангрэсе мясцовых і рэгіянальных уладаў. Кантактная група арганізуе стажыроўкі, туры, прасоўвае адмену смяротнага пакарання і рэформу мясцовага самакіравання. Дэлегацыя ў ПАРЕ працуе па шасці кірунках — ад адказнасці рэжыму да падтрымкі моладзі і медыя, рыхтуе даклады і далучаецца да палітычных групаў. У Кангрэсе прыярытэтамі з'яўляюцца рэформа самакіравання, адукацыя і падтрымка беларускіх ініцыятываў. Сярод вынікаў — Люксембургскія рашэнні, узмацненне ціску на рэжым і абарона правоў беларусаў.

## *Міжнародныя адвакацыйныя кампаніі*

Анастасія Свіркова і Дзмітрый Васерман распавялі пра працу Народных амбасадаў, якія дапамагаюць беларусам за мяжой і праводзяць шырокія адвакацыйныя кампаніі. Напрыклад, пасля спынення выдачы пашпартоў праз консульствы яны дамагаліся рашэнняў для палепшанай выдачы беларусам ВНЖ і дакументаў замежніка. Напрамкі дзейнасці ўключаюць дапамогу палітвязням, легалізацыю і абарону, культурніцкую дыпламатыю, працу па перадухіленні пераследу, пытанні мабільнасці, банкаўскіх рахункаў і візаў. Амбасады застаюцца ў кантакце з мясцовымі ўладамі пасля візітаў Святланы Ціханоўскай, каб вырашаць акрэсленыя праблемы.

## *Belarus Tomorrow*

Павел Свярдлоў прадставіў першую стрымінгавую платформу для незалежных беларускіх медыя з пастаянным спадарожнікавым вяшчаннем праз Hotbird, даступным у Беларусі, ЕС, Турцыі і Расіі. Даступныя таксама web-версія і прыкладанне для Google TV, што дазваляе абыходзіць блакіроўкі. Мэтавая аўдыторыя — ад нейтральных гледачоў да актыўных прыхільнікаў пераменаў і беларусаў за мяжой. Праект аб'ядноўвае 20 беларускіх медыя і стаў прататыпам грамадскага тэлебачання. За няпоўны год створаная сетка вяшчання, дызайн і ўпакоўка, наладжанае спадарожнікавае і тэставыя

інтэрнэт-вяшчанне. Планы — развіццё кантэнту, уласная студыя, мабільная версія і выхад у кабельныя сеткі. Спадарожнікавы сігнал заблакаваць немагчыма, а мець праграму на тэлевізары дастаткова бяспечна, бо знайсці яе сілавыя структуры могуць толькі пры фізічным доступе да прылады.

## *Структура дэмсілаў — Франак Вячорка*

Структура беларускай дэмакратычнай супольнасці грунтуецца на ўзаемным даверы і ўключае тры асноўныя інстытуты — Офіс Святланы Ціханоўскай, Аб’яднаны пераходны кабінет і Каардынацыйную раду. Іх дзейнасць умацоўваецца легітымнасцю нацыянальнай лідаркі, але сама структура не з’яўляецца сталай і можа змяняцца. Паўнамоцтвы інстытутаў часам перасякаюцца, і ў такіх выпадках шукаюцца ўзгодненыя рашэнні. У склад Кабінета ўваходзяць восем прадстаўніцтваў (адно цяпер неактыўнае) разам з камандамі, а прызначэнні прадстаўнікоў адбываюцца па рашэнні Святланы Ціханоўскай з адабрэння Каардынацыйнай рады. Офіс Ціханоўскай забяспечвае яе дзейнасць і часткова працу Кабінета, падтрымліваючы шчыльную камунікацыю паміж дзвюма інстытуцыямі.

Дэмакратычныя сілы ўяўляюць сабой шырокую супольнасць з рознымі сектарамі, у якіх кожны працуе па ўласным кірунку і самастойна знаходзіць рэсурсы. Святлана Ціханоўская не мае безумоўнага кіраўніцтва над усімі сектарамі і не можа наўпрост уплываць на іх фінансаванне. Паводле Франка Вячоркі, больш эфектыўна працаваць з каардынаванымі сектарамі, чым з асобнымі арганізацыямі, таму ён заклікаў да ўзгаднення пазіцыяў і супольнага прасоўвання інтарэсаў. Агульную колькасць арганізацыяў і нефармальных групаў беларускай дэмакратычнай супольнасці ён ацаніў прыкладна ў 1700.

Структура дэмсілаў



*Панэль 5:*

# Беларуская культура: як рабіць яе модна, сучасна, па-беларуску?

**Дыскусію мадэравала паэтка, вядучая і аўтарка медыяпраектаў Валярына Кустава. Удзел прынялі:**

- **Вольга Кардаш** — дызайнерка;
- **Міхась Зуй** — акцёр, член аб'яднання «Вольныя купалаўцы»;
- **Вінсэнт (Зміцер Папко)** — музыка, хіп-хоп-выканаўца;
- **MANDZIK (Дзяніс Мандзік)** — музыка, хіп-хоп-выканаўца.

Размова пачалася з абмеркавання сучасных тэндэнцыяў у беларускай культуры за апошнія пяць гадоў. Вінсэнт адзначыў падзел беларускай культуры на ўмоўна «дзяржаўную» і незалежную, ***вылучыўшы росквіт культуры — асабліва ў эміграцыі***, дзе няма рэпрэсіяў і бюракратычных абмежаванняў, а таксама актыўнае развіццё анлайн-прасторы. Міхась Зуй падкрэсліў, што фарматы беларускай культуры павінны быць разнастайнымі і ***развіццё павінна быць арганічным — зыходзіць ад творцаў і грамадства,*** а не ад вызначаных палітыкамі прыярытэтаў. Вольга Кардаш падкрэсліла важнасць захавання культурнай спадчыны праз інтэграцыю яе ў сучасныя штодзённыя прадукты, каб культура стала бліжэйшай да людзей.

Дзяніс Мандзік адзначыў адкрытасць маладой генерацыі да новых фарматаў і ідэй, а таксама неабходнасць прызнаваць разнастайнасць у беларускай культуры без выключэння тых, хто адрозніваецца па мове ці пасылах. Ён і іншыя спікеры гаварылі пра росквіт беларускай культуры як унутры краіны, так і ў эміграцыі, адзначаючы ***змену фокусу з палітычных тэмаў на больш шырокі спектр паўсядзённых і мастацкіх.***

У дыскусіі таксама падніміліся пытанні моўнай ідэнтычнасці: Зміцер Папко заклікаў падтрымліваць менавіта беларускую культуру на беларускай мове як адзін з фактараў бяспекі і нацыянальнага яднання, тады як іншыя спікеры адзначылі неабходнасць уключэння кантэнту на іншых мовах без выключэння яго з агульнага культурнага поля. Спікеры падкрэслілі, што беларуская культура не павінна быць выключна палітычнай, і што рускамоўныя творы беларускіх аўтараў таксама маюць месца ў культурнай прасторы.

У дачыненні да праблем развіцця культуры былі вылучаныя ***ключавыя выклікі: недахоп сродкаў для самафінансавання,*** неабходнасць падтрымкі з боку фондаў і мецэнатаў, патрэба ў большай колькасці якасных беларускіх прадуктаў і ў развіцці індустрыі, здольнай да масавасці і камерцыйнасці. Спікеры адзначылі хрупкасць цяперашняга адраджэння, якое залежыць ад сацыяльна-палітычнай сітуацыі.

На заканчэнне кожны з удзельнікаў даў парады і заклікі: рабіць сваю справу якасна і з усведамленнем нацыянальнай каштоўнасці культуры,

падтрымліваць творцаў і не замінаць ім, прымаць разнастайнасць у культурнай прасторы і ствараць прадукты, цікавыя як беларусам, так і замежнай аўдыторыі. ***Беларуская культура была прадстаўленая як важны фактар аб'яднання грамадства як унутры краіны, так і сярод дыяспары.***







# «Мапа Шляху»: што натхніла і расчаравала ўдзельнікаў (-іц) Канферэнцыі з 2020 года

Падчас Канферэнцыі ўдзельнікам і ўдзельніцам прапаноўваліся дзве актыўнасці. У межах адной была магчымасць адзначыць свой родны горад на мапе Беларусі, на іншай — «Мапе Шляху» — адзначыць падзеі апошніх 5 гадоў, якія натхнілі ці, наадварот, расчаравалі.

За апошнія пяць гадоў удзельнікі «Мапы Шляху» перажывалі супярэчлівыя эмоцыі. Многія ўзгадвалі моманты надзеі і натхнення, калі грамадзяне аб’ядноўваліся ў барацьбе за дэмакратычныя перамены: збор подпісаў і ўдзел у выбарах 2020 года, студэнцкія забастоўкі і валанцёрскія ініцыятывы. Узрушыла людзей тое, як беларусы і беларускі падтрымлівалі адно аднаго і прасоўвалі ідэі праз міжнародныя платформы, а таксама акцыі супраць гвалту і за правы чалавека. Пазітыўныя эмоцыі выклікалі праца структураў і ініцыятываў — у прыватнасці, узгадваліся «Сумленныя людзі», «еЗдароўе», Народныя амбасады — і высілкі па распрацоўцы пазітыўнай альтэрнатывы. Людзі адзначылі антываенныя структуры і акцыі супраціву — Полк Кастуся Каліноўскага, рэйкавых партызанаў, атаку на расійскі ДРЛА ў Мачулішчах, кампанію «НЕ вайне».

Разам з тым, удзельнікі таксама адзначалі расчараванне і сум з-за рэпрэсіяў і эміграцыі. Падзеі, звязаныя з арыштамі, пагрозамі з боку ГУБАЗіКа, і іншымі акцыямі ціску на грамадскія ініцыятывы, выклікалі засмучэнне. Эміграцыя, страта кантактаў і магчымасцяў працаваць на роднай зямлі для многіх сталі цяжкім выпрабаваннем. Расчаравалі людзей і няўдалыя ці незавершаныя ініцыятывы або разлад у структурах — такія падзеі, як пагром «Моладзевага Хабу», аб’яўленая ў 2021 г. забастоўка або «План Перамога», які не быў рэалізаваны.

Тым не менш, «Мапа Шляху» паказала, што ў цяжкія моманты беларускае грамадства здольнае перажываць сум, але не губляе здольнасці да супольнай актыўнасці і натхнення.

